# І РАСІЯ: АБ ВАЙНЕ

лі не створым кінастужкі, выстаўкі, кнігі, то ўсё страцім. І тут вельмі дарэчы аб'ядналь намаганні Беларусі і Расіі, іншых дзяржаў, якія аб'ектыўна ставяцца да гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Толькі сумеснымі намаганнямі можна нешта зрабіць у імя захавання памяці аб вайне, аб тым, што нам расказвалі нашы бацькі і дзяды.

**Сяргей АЗАРОНАК:** — Адным з захавальнікаў памяці з'яўляюцца музеі. І магчыма, неабходна таксама аб'яднаць намаганні ў працы над тым праектам, аб якім я расказую. Музей ваеннай гісторыі Беларусі і фонд «Культурная спадчына і сучаснасць» стварылі выставу, сэнс якой наладзіць дыялог паміж дзецьмі вайны (юнгамі, сынамі палкоў, малалетнімі вязнямі і непаўналетнімі працаўнікамі тылу, якія ставілі скрыні, каб дацягнуцца да станка, на якім апрацоўвалі міны, што потым ішлі на фронт) і дзецьмі міра, якія прадстаўляюць сучаснае пакаленне. Гэты дыялог паміж дзецьмі вайны і тымі, хто не ведае аб вайне, але жыве ў арэоле памяці аб ёй, паказаны праз выставачны праект. Іх успаміны, думкі мы ўжо пачынаем змяшчаць у інтэрнэце. Сімвалічна, што гэтая выстава адкрылася не толькі ў Маладзечне, культурнай сталіцы Беларусі, а і ў Маскве, на ВДНГ. Мы таксама запісалі выказванні маленькіх масквічоў аб вайне. І цікава, што расійскія і беларускія дзеці кажуць адно і тое ж — слова ў слова. Таму вельмі важна, калі ваенная гісторыя Беларусі кансалідуецца з нашымі бліжэйшымі саюзнікамі і братамі.

**Алена КАЛГІНА:** — Мы вельмі шмат кажам пра выхаванне падрастаючага пакалення. Але ў асноўным гаворым пра маладых. У той жа час больш старэйшае пакаленне таксама трэба выхоўваць і заклікаць да захавання памяці, бо калі мы будзем накіроўваць свае сілы толькі на дзяцей, а яны будуць вяртацца ў сем'і, дзе не шануюць традыцыі сваіх продкаў, уся праца не прынясе карысці.

**Аляксандр ЛУГІН:** — Я лічу, што ў кожнай сям'і павінен быць куток, які б расказваў аб гераізме продкаў. Ды і 9 Мая трэба адзначаць як належыць, а 22 чэрвеня нагадваць, чаму мы лічым гэты дзень днём смутку і колькі людзей загінула ў той жудаснай вайне. Я зрабіў партрэты свайго дзеда і дзеда жонкі, размясціў іх на сваёй старонцы ў сацыяльных сетках з удзячнасцю. Мой дзед — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, партызан, ваяваў і ў фінскую. Дзякуй Богу, вярнуўся, нешта паспеў расказаць. Быў бы я больш дарослым, распытаў бы больш. Але і яны былі нешматслоўныя...

**Мікалай ЗЯМЦОЎ:** — Сапраўды, самая вялікая спадчына захоўваецца ў сем'ях. І нам трэба прад'явіць яе свету. Калі Сяргей Іванавіч паказаў лагатып з сімволікай краін-саюзніц, але без СССР, я не здзівіўся. Разумею, што гэта выстрал. Таму нам неабходны свае выстаўкі ў Еўропе, дзе будуць паказаны тыя сведчанні, якія патрэбны нам. І я спадзяюся, што, пачынаючы з наступнага года, сумесныя беларуска-расійскія выстаўкі пройдуць у Еўропе. Прычым ёсць магчымасць правесці іх з аншлагам. І гэта будзе да вялікага задавальнення той часткі Еўропы, якая захавала памяць, якая, як і мы, абураецца гэтым нахабным перайначваннем гісторыі. Такія людзі ў Еўропе яшчэ ёсць. Часцяком гэта нашчадкі воінаў антыгітлераўскай кааліцыі. Ім трэба падставіць плячо, даць глыток свежага паветра. І беларуска-расійскія пляцоўкі маглі б стаць цэнтрам збору той часткі Еўропы, якая не хоча быць апранута ў шынель неафашызму. Час прыйшоў. Мы палічылі, што каля 300 мільёнаў чалавек на прасторы Еўразіі з'яўляюцца нашчадкамі савецкіх салдат. Гэта наш не да канца ўсвядомлены рэсурс.

**Анатоль ШАРКОЎ:** — Мне нярэдка даводзіцца выступіць за мяжой па тэме Вялікай Айчыннай вайны. І вельмі часта на такія мерапрыемствы запрашаюць людзей, якія або прытрымліваюцца агульнапрынятай у Еўропе лініі аспрэчвання Перамогі Савецкага Саюза ў вайне, або абсалютна некампетэнтныя ў тэме. Выступаючы і ў Гейдэльбергскім, і ў Саарландскім універсітэтах, і ў Сарбоне, я бачыў цікавасць еўрапейскай моладзі да аб'ектыўнай гісторыі.

***Калі ў кожнай сям'і дзеці і ўнукі будуць ведаць, хто ў гады вайны быў іх бацька і дзед, як яны ваявалі, якія ўзнагароды мелі, то нам няма чаго баяцца.***

**Сяргей АЗАРОНАК:** — Даводзілася неяк прысутнічаць на 3-м кангрэсе спаленых вёсак у Музеі Славацкага нацыянальнага паўстання. Вы б бачылі, якія бурныя дыскусіі адбываліся сярод моладзі. Але не гэта ўразіла. Аказваецца, сучасныя еўрапейскія гісторыкі не ведаюць, колькі беларускіх вёсак знішчылі фашысты і што 186 дагэтуль не адноўлены. Яны былі ў шоку, казалі, што такога быць не можа. Тым не менш пэўныя пляцоўкі праўды на Захадзе ёсць.

**Алена КАЛГІНА:** — Таму трэба шукаць грамадскую арганізацыю за мяжой, у Еўропе, з якой можна абменьвацца вопытам, архіўнымі дакументамі, ствараць пэўныя аўтарытэтныя пляцоўкі, дзякуючы якім не толькі ў Беларусі і Расіі, а і ва ўсім свеце, будуць захоўваць памяць пра вайну і перадаваць яе будучым пакаленням.

**Мікалай ЗЯМЦОЎ:** — Мне б хацелася ў наступным годзе ўбачыць шэсце беларускіх нашчадкаў партызан. Партызанскі рух як вобраз грамадзянскага супраціўлення — своеасаблівы падарунак ад беларускіх партызан. Ён неацэнны і павінен быць прад'яўлены свету. Подзвіг беларускіх партызан непераўзыдзены. Беларусь — зямля лясоў, якая прадэманстравала свету татальнае супраціўленне ўсяго народа, які гатовы загінуць, але не быць скораным.

**Сяргей АЗАРОНАК:** — А ў нас ёсць і гістарычная нагода правесці парад партызан. Колькі краін рабіла гэта?

**Аляксандр ЛУГІН:** — Калі казаць аб сумесных ваенна-патрыятычных акцыях Беларусі і Расіі. Упраўленне па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Узброеных Сіл Беларусі і 52-гі асобны спецыялізаваны пошукавы батальён штогод праводзяць сумесныя пошукавыя работы на тэрыторыі нашай краіны. Летась, напрыклад, прадстаўнікі «Дабрачыннага ваенна-гістарычнага пошукавага клуба «Памяць і прымірэнне» Маскоўскай абласной грамадскай арганізацыі ўдзельнічалі ў пошукавых работах у Віцебскім раёне. У выніку паднялі 66 астанкаў загінуўшых у 1944 годзе чырвонаармейцаў, знайшлі адзін медальён, чатыры ўзнагароды — адпаведна ўстаноўлены імёны чатырох салдат. Сёлета яны працавалі ў Лёзненскім раёне і знайшлі 29 астанкаў салдат. Больш чым 10 гадоў з Чалябінскай вобласці да нас прыязджае пошукавы атрад «Уралец». Часта супрацоўнічаем з прадстаўнікамі пошукавых атрадаў Пензенскай і Ніжагародскай абласцей, Рэспублікі Татарстан. І гэта не адзіныя прыклады сумесных пошукавых работ.

**Сяргей АЗАРОНАК:** — Цяпер такі час, калі сыходзяць носьбіты гістарычнай памяці, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. Таму далейшы ўдар будзе наносіцца ўжо па свядомасці. Не будзе дзядулі або прадзядулі, які засадзіць на калені свайго нашчадка і раскажа яму пра вайну (і гэта самая лепшая агітацыя). А мы ўжо не так гаворым пра вайну, як рабілі гэта ўдзельнікі падзей. Яны пераможцы, а мы спадчыннікі Перамогі. А што такое Перамога? Гэта ж не матэрыяльная каштоўнасць. Гэта выснова розуму. Дастаткова памяняць у свядомасці гэтае паняцце, дэвальваваць, змяніць яго — і мы ўжо не спадчыннікі Перамогі.

**Мікалай ЗЯМЦОЎ:** — Таму трэба перастаць абурацца, а пачаць адточваць наш інструментарый, які павінен быць аўтарытэтным. Гісторыі, расказаныя ад першай асобы або членамі іх сем'яў, з'яўляюцца сведчаннямі, з якімі цяжка спрачацца. Асабліва калі іх сотні тысяч і нават мільёны. Мы ствараем той інструментарый, які дазволіць парываваць усе гэтыя выпады. Тое, што іх будзе больш, ніколькі не сумняваюся. І тут мы спадзяёмся на дапамогу Беларусі — краіны, якая беражліва адносіцца да сваёй вялікай гісторыі.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

■ 22 чэрвеня. 4 гадзіны раніцы

# ВЯНКІ ПАМЯЦІ НА ВАДЗЕ БУГА

## Традыцыям сустрэч на світанні спаўняецца паўвека

**Даўно вырасла пакаленне брастаўчан, для якога дата 22 чэрвеня — асаблівая. У гэты дзень успамінаюць абаронцаў Брэсцкай крэпасці, байцоў і камандзіраў невялікага гарнізона, якія мужна і самаадданна выконвалі свой воінскі абавязак.**

Пра подзвіг герояў Цытадэлі ведаюць многа дзе ў свеце. У гэты дзень у Брэст прыязджае, як правіла, шмат гасцей. Ноччу людзі ідуць у крэпасць. Памятныя мерапрыемствы пачынаюцца а чацвёртай гадзіне раніцы. Па традыцыі праходзіць жалобны мітынг, кладуцца кветкі да Вечнага агню, вянкі з запаленымі лампадкамі спускаюцца на воды Заходняга Буга. У гэтым годзе да 75-годдзя абароны супрацоўнікі мемарыяльнага комплексу рэалізавалі экспазіцыйны праект «Я — крэпасць, вяду бой...». Аснову праекта складае выстава з аднайменнай назвай і акцыя «Бессмяротны гарнізон». На месцах баёў на тэрыторыі мемарыяла ўстаноўлены фотаздымкі ўдзельнікаў абароны, а таксама інфармацыйныя таблічкі, дзе ў перыяд з 1949 да 2015 года былі знойдзены астанкі загінулых.

Вучоны сакратар «Мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» Алена ХАРЫЧКАВА расказвае, як пачыналіся сустрэчы на світанні. Пачаткам можна лічыць мерапрыемства 1965 года, калі тут сабраліся ўдзельнікі Злёту паходаў моладзі па месцах баявой славы. Вядома, паход быў усесаюзны. Тады ў Брэст прыехалі легендарныя асобы: маршал Савецкага Саюза Іван Конеў і маршал артылерыі Васіль Казакоў, пісьменнікі Канстанцін Сіманаў і Сяргей Смірноў. Разам з моладдзю былі вядомыя ўжо абаронцы крэпасці Самвел Мацевасян, Радзівон Семянюк, Герой Савецкага Саюза Пётр Гаўрылаў і многія іншыя. Дарэчы, летась Брэсцкую крэпасць наведала сям'я пісьменніка Смірнова, яны прыехалі з нагоды 100-годдзя з дня нараджэння Сяргея Сяргеевіча. А некалькімі гадамі раней тут жа адзначалі 100-гадовы юбілей свайго бацькі і дзеда нашчадкі Мацевасяна.

Дык вось тады, калі яшчэ не было мемарыяльнага комплексу, а ўдзельнікі размясціліся ў палатачным гарадку на Кобрынскім умацаванні крэпасці, тут адбылася пантаміма-феерыя «Сталлі насмерць!» Дзею ажыццявілі артысты Маскоўскага цырка і салдаты Брэсцкага гарнізона. Відавочцы расказвалі, што падчас спектакля слёзы стаялі ў вачах і маладых, і ветэранаў. Адсюль, відаць, і бярэ вытокі традыцыя рэканструкцый падзей чэрвеня 1941-га.

Пазней, у 70-я гады, калі быў створаны мемарыял, абаронцы крэпасці сталі рэгулярна прыязджаць на сустрэчы — часцей за ўсё яны ладзіліся 22 чэрвеня. Паводле слоў Алены Харычкавай, знакавым стаў 1991 год. Да 50-годдзя абароны прымеркавалі злёт ветэранаў Брэсцкага гарнізона 1941 года. На яго прыехалі 645 чалавек! У іх ліку былі члены сем'яў загінулых: жонкі, дзеці, унукі, праўнукі. Да таго мерапрыемства распрацавалі новы сцэнарый сустрэч на світанні. У 3.30 раніцы ўсе сабраліся на плошчы каля ўвахода ў мемарыял і пад гукі фанаграмы прайшлі па цэнтральнай алеі крэпасці, пакідаючы кветкі і свечкі ў дарагіх для іх мясцінах. А пятай гадзіне падышлі да Усходняга форта, дзе запалілі касцёр Памяці.

— Гэта была адна з самых запамінальных і кранальных сустрэч, — гаворыць Алена Уладзіміраўна. — Як аказалася, многія прыехалі сюды ў апошні раз, гады бралі сваё, старыя раны не спрыялі здароўю.

Асаблівым для крэпасці стаў і 1995 год. Упершыню па загінулых адслужылі памінальную ліцію, тады ж Патрыярх Маскоўскі і Усяе Русі Алексій ІІ асвяціў Свята-Мікалаеўскі гарнізонны храм. Праз год, у 1996-м, на мітынг Памяці ў крэпасць прыехалі Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Барыс Ельцын. Тады ж было прынятае рашэнне аб рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу. Для збору сродкаў правялі тэлерадыёмарафон. Абаронцаў крэпасці з іншых гарадоў тым разам прыехала крыху больш за дзясятак. Падчас мітынгу адбылося перапахаванне 112 астанкаў загінулых пад мемарыяльныя пліты.

У 1999 годзе нарадзілася новая традыцыя — спуск вянка Памяці ў воды ракі Заходні Буг, туды, дзе знаходзіўся напрамак галоўнага ўдару гітлераўцаў. З 2000 года мітынгі сталі праводзіцца ў двары Цытадэлі каля Цярэспальскіх варотаў, бо невялікая пляцоўка на беразе ракі не змяшчала ўсіх ахвотных. Традыцый станавілася болей, на дзень Памяці прыязджалі расіяне. На мітынг з нагоды 60-годдзя абароны крэпасці ў 2001 годзе прыбыў «Поезд Памяці» з Масквы. У мерапрыемствах удзельнічалі хор імя Пятніцкага, кубанскі казацкі хор «Русь», ансамбль песні і танца імя Аляксандрава, артысты Людміла Зыкіна, Сафія Ратару, Муслім Магамаеў, кампазітар Аляксандра Пахмутава, паэт Мікалай Дабранраваў і іншыя.



Тая ўрачыста-жалобная акцыя добра запомнілася і аўтару гэтых радкоў. На прэс-канферэнцыі вядомы акцёр Міхаіл Ульянаў сказаў, што яго вельмі кранула ўсё, што адбывалася на світанні: «Я артыст, я лёгка пазнаю, калі іграюць. Тут усё было сапраўдным, а не паказным».

22 чэрвеня 2008 года крэпасць наведаў Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Дзмітрый Мядзведзеў. Гаворка зайшла і аб сумесных культурных і гуманітарных праектах. А праз два гады адбылася памятная ноч у крэпасці. Мерапрыемствы пачаліся задоўга да ранішняга мітынгу — прэзентацыйным паказам сумеснага расійска-беларускага фільма «Брэсцкая крэпасць». Артысты, удзельнікі здымачнай групы глядзелі кіно разам з ветэранамі і шматлікімі гасцямі. Калі ішоў фільм, не было часу думаць і супастаўляць карцінкі з рэальным месцам падзеі. Усё паказанае адбывалася на тым самым месцы, дзе стаяў экран, сядзелі гледачы, а за 30 метраў цякла рака, да якой не маглі дабрацца знясіленыя смагай... А вось пасля прагляду гэта адчуванне ахапіла адразу. Вось тыя казармы, вось месца, дзе стаялі дамы камандзіраў! Хацелася вызначыць канкрэтна, дзе знаходзіўся камісар Фамін, адкуль падымаў у атаку байцоў маёр Гаўрылаў. Як толькі скончыўся фільм, яго прадзюсар Ігар Угольнікаў запрасіў усіх на сімвалічную акцыю: набраць вады з рэчкі ў біклагі і выліць іх у каску каменнага салдата са скульптурнай кампазіцыі «Смага»... Яшчэ перад прэм'ерай Андрэй Мярзлікін, які сыграў ролю камандзіра заставы Андрэя Кіжаватава, выказаў спадзяванне, што прататыпы герояў засталіся б задаволенымі карцінай...

Сёлета падчас ранішніх мерапрыемстваў лягуць кветкі і да помніка героям мяжы, адкрытага 22 чэрвеня 2011 года. Першы з герояў — Андрэй Мітрафанавіч Кіжаватаў, ён загінуў, не саступіўшы ворагу ні пядзі зямлі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**

■